КАНФЕРЭНЦЫЯ
НОВАЯ
БЕЛАРУСЬ 2025

Праект

# Палітычная рэзалюцыя Дэмакратычных сілаў Беларусі да канферэнцыі “Новая Беларусь”

Грунтуючыся на артыкулах 1 і 3 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 1994 года, паводле якіх Беларусь з'яўляецца унітарнай дэмакратычнай сацыяльнай прававой дзяржавай, дзе адзінай крыніцай дзяржаўнай улады і носьбітам суверэнітэта з'яўляецца народ;

Канстатуючы, што грамадзяне і грамадзянкі Беларусі пазбаўленыя рэальнага права выбару, і фактычна ўлада ў Беларусі захопленая групай асобаў, якая не служыць грамадству і арганізуе супраць яго рэпрэсіі;

Канстатуючы, што ў 2020 годзе сотні тысяч грамадзян Беларусі выйшлі па ўсёй краіне на масавыя акцыі пратэсту супраць фальсіфікацыі вынікаў выбараў і падтрымалі тры асноўныя патрабаваннні: спыніць рэпрэсіі, вызваліць палітычных вязняў і правесці новыя дэмакратычныя выбары, якія да сённяшняга дня не выкананыя;

Падтрымліваючы самаарганізацыю беларускага грамадства як сістэму супрацы палітычных інстытутаў (Аб'яднанага пераходнага кабінета, Офіса Святланы Ціханоўскай і Каардынацыйнай рады), палітычных партый, няўрадавых, праваабарончых і дыяспаральных арганізацый, грамадзянскіх ініцыятыў, дабраахвотнікаў і дабраахвотніц, незалежных медыяў, блогераў і блогерак і актыўных грамадзян і грамадзянак дзеля таго, каб вярнуць дзяржаву народу;

Мы, прадстаўнікі і прадстаўніцы Дэмакратычных сілаў Беларусі,

Пацвярджаем, што нашымі агульнымі мэтамі з'яўляюцца захаванне незалежнасці Беларусі і пераход нашай краіны да ўстойлівай дэмакратыі ў адпаведнасці з артыкуламі 1 і 3 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;

Рашуча выступаем супраць саўдзелу кіруючага ў Беларусі рэжыму ў ганебнай агрэсіі Расіі супраць Украіны насуперак нацыянальным інтарэсам і Канстытуцыі Беларусі, заяўляем пра сваю падтрымку справядлівай барацьбы Украіны за сваю незалежнасць, у тым ліку сіламі беларускіх дабраахвотнікаў і дабраахвотніц, якія бароняць Украіну, і пра неабходнасць прыцягнення вінаватых да адказнасці за агрэсію;

Патрабуем спыніць палітычныя рэпрэсіі у Беларусі, вызваліць палітычных зняволеных і правесці новыя свабодныя і справядлівыя выбары усіх органаў улады;

Прапануем вывесці Беларусь з палітычнага крызісу шляхам правядзення нацыянальнага дыялогу, вынікам якога было б нацыянальнае прымірэнне, спыненне рэпрэсій і вызваленне палітычных зняволеных і правядзенне свабодных і справядлівых выбараў дзеля аднаўлення даверу народа да ўлады і спынення палітычнага канфлікту ў краіне; прапанова правядзення перамоваў была сфармулявана яшчэ ў 2020 годзе, і за яе прагаласавала больш за 780 тысяч беларусаў і беларусак;

Вітаем пачатак працэсу вызвалення палітычных зняволеных, аднак, лічым такія крокі недастатковымі ва ўмовах працягу палітычных рэпрэсій і прымусовых дэпартацый з краіны;

Выказваем удзячнасць міжнародным партнерам, дзяржавам-сяброўкам Еўрапейскага Саюза, Злучаным Штатам Амерыкі, Вялікабрытаніі, Канадзе, Нарвегіі і іншым краінам, Радзе Еўропы, ААН, АБСЕ і іншым міжнародным арганізацыям, за спрыянне вызваленню палітычных зняволеных і падтрымку барацьбы беларускага грамадства за незалежнасць сваёй краіны і дэмакратыю;

Выказваем удзячнасць Еўрапейскаму Саюзу за прыняцце Усеабдымнага плана падтрымкі Беларусі ў перыядзе яе перахода да дэмакратыі і ўважаем гэта за знак гатоўнасці да вялікіх інвестыцый у дабрабыт і еўрапейскую будучыню Беларусі;

Выказваем удзячнасць Парламенцкай Асамблеі Рады Еўропы за прыняцце Люксембургскіх рашэнняў як рэкамендацый для нацыянальных парламентаў па падтрымцы дзейнасці беларускага грамадства ў выгнанні, мабільнасці беларусаў і беларусак, адукацыйных, культурных, грамадскіх сувязяў, заклікаем нацыянальныя парламенты да імплементацыі Люксембургскіх рашэнняў;

Выказваем удзячнасць краінам, што прынялі ў сябе беларусаў і беларусак, якія былі дэпартаваны ці вымушаны былі пакінуць Беларусь з-за палітычных рэпрэсій;

Заклікаем міжнародную супольнасць працягваць намаганні дзеля вызвалення палітычных зняволеных і спынення рэпрэсій у Беларусі;

Заклікаем да прыцягнення прадстаўнікоў і прадстаўніц рэжыму Лукашэнкі да адказнасці за залачынствы супраць чалавечнасці ў дачыненні да беларускага народа, а таксама ваенна-палітычнага кіраўніцтва Беларусі за саўдзел у злачынстве агрэсіі супраць Украіны і незаконнае перамяшчэнне і індактрынацыю ўкраінскіх дзяцей;

Заклікаем міжнародную супольнасць працягваць і пашыраць падтрымку беларускіх незалежных медыяў, праваабаронцаў, грамадзянскай супольнасці і інстытутаў Дэмакратычных сіл Беларусі;

Адзначаем, што Дэмакратычныя сілы не толькі змагаюцца за змены, але і рыхтуюцца да іх. Распрацаваны праект Канстытуцыі, законапраекты, канцэпцыі рэформаў, канцэпцыі люстрацыі і кампенсацыі шкоды ахвярам рэпрэсій, план дзеянняў у пераходны перыяд, каб Беларусь стала краінай, якая служыць сваім грамадзянам і грамадзянкам і з'яўляецца важнай часткай сістэмы бяспекі ў рэгіёне;

Заклікаем усіх памятаць пра нашы галоўныя мэты і каардынаваць сваю працу дзеля іх дасягнення пры разуменні, што беларускае грамадства вельмі разнастайнае, складаецца з людзей і арганізацый з рознымі палітычнымі поглядамі, і што дыскусіі і спрэчкі ў дэмакратычным руху з'яўляюцца нармальнай з'явай.

Мы аб'ядноўваем намаганні і ідзем наперад, каб вярнуць беларусам Беларусь і зрабіць Беларусь краінай, якую паважаюць у свеце і дзе людзі маюць рэальнае права выбару, улада паважае сваіх грамадзян і грамадзянак і служыць грамадству.

Жыве Беларусь!